## ТАНАТАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ЎНІЯТАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА КАНЦА XVI–XVIII ст.

**Стахно Ніна Валер'еўна**
настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі
«Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта»;
кандыдат гістарычных навук

*Дадзены артыкул прысвечаны праблеме фарміравання ва ўніятаў Вялікага Княства Літоўскага ўяўленняў пра патойбаковы свет. Аўтар надае асаблівую ўвагу даследаванню фарміраванню ва ўніяцкіх катэхізісах такога паняцця як чысцец, якое было характэрна для каталікоў і адсутнічала ў праваслаўных.*

У 1596 г. у Берасці было абвешчана рашэнне аб утварэнні ўніяцкай царквы. Агульнавядомым фактам з'яўляецца прыняцце ўніятамі каталіцкай дагматыкі з захаваннем праваслаўнай абраднасці. У сувязі з гэтай акалічнасцю асабліва цікавым становіцца пытанне ўяўленняў пра замагільны свет у дадзенай частцы хрысціянскага свету. Падчас рэканструкцыі гэтых уяўленняў мы будзем абапірацца ў першую чаргу на катэхізісы, якія былі адным з асноўных сродкаў распаўсюджання хрысціянскіх дагматаў ва ўніяцкай трактоўцы.

Першае, што хацелася б адзначыць, – гэта блізкасць тэкстаў уніяцкіх катэхізісаў да падобных твораў у каталіцкім касцёле. Найчасцей уніяты перакладалі і адаптавалі ці проста цытавалі катэхізісы езуітаў Якуба Ледэсмы і Рабэрта Беларміна. Напрыклад, Р. Беларміна вылучае дзве катэгорыі грахоў – першародны і ўчынёны (які, у сваю чаргу, падзяляецца на веніяльны (powszedni) і смяротны). Першародны грэх адпускаецца праз прыняцце хрышчэння, смяротны – робіцца насуперак любові Божай і пазбаўляе чалавека духоўнага жыцця– Божай ласкі. Набытыя грахі мы адбываем праз сакрамент пакуты: калі не адпакутвалі – патрапім у пекла. Аналагічны тэкст чытаем і ва ўніяцкіх катэхізісах.

Што датычыцца фарміравання ва ўніяцкай царкве ўяўленняў пра «трэцяе месца», куды трапляе душа пасля смерці, прадстаўленае ў католікаў чыстцом, а ў праваслаўных фактычна адсутнае, першапачаткова выяўляецца кампрамісны характар. У першым уніяцкім катэхізісе, выдадзеным у 1628 г., аўтарства якога прыпісваецца І. Кунцэвічу, выкарыстоўваецца праваслаўны тэрмін «мытарствы». Пры ўсім адрозненні ў разуменні пасмяротных лёсаў хрысціян у каталіцкай і праваслаўнай традыцыях, у дадзеным выпадку гаворка не ідзе пра разыходжанні эсхаталагічных уяўленняў – тут практычна даслоўна цытуецца дадзенае Я. Ледэсмай апісанне чыстца, а ад праваслаўнай традыцыі захоўваецца толькі тэрмін: «Есть и называетъся тое мѣсце мыта(р)ствомъ, до которого идуть оумираючи въ ласце б(о)жой, толко идъ досыть не оучынили въ томъ жывотѣ за прошлые грѣхи, небудутъ видѣти лица б(о)ж(о)го, а(ж) выплатя(т) ся з того в чомъ винни зостали, а выплатившы се и тые пойдутъ до хвалы н(е)б(ес)ное» [1, с. 20].

У наступным, датаваным 1685 г., ананімным катэхізісе таксама выкарыстоўваецца тэрмін «мытарствы», але зноў жа адрозненняў ад каталіцкага чыстца ў апісанні мы не знаходзім: «Справедливыхъ души заразъ идутъ до Н(е)ба; грѣшныхъ зара(з) до пекла. Тыхъ зась котрыи грѣшили, еднакъ за грѣхи жаловали, и оныхъ с(вя)щеннико(м) сповѣдалися, и разгрѣшеня о(т) нихъ отримали, але способами досыть оучиненя, о(т) Б(о)га позволеными, то есть Постом, м(о)л(и)твами, и ялмужнами, досы(т) еще за грѣхи свои не оучинили, идутъ на мытарства, котрыи всходняя ц(е)рковъ на повѣтру быти повѣдаютъ. Ижъ тамъ духове ѕлобы по(д)н(е)б(ес)ныи, то есть дїаволи души таковыи турбуютъ, смуаютъ, и трапятъ. А заходняя ц(е)рковъ чистцемъ називаетъ: и повѣдаютъ, же мѣстце ест его в певной части земли, где души огнемъ чистя(т)ся, и также дїаволи и(х) трапя(т). По котрым очищенїи еще пре(д) суднымъ днемъ до н(е)ба презъ а(н)г(е)ловъ пренесены бываютъ, яко скоро очистятся» [2, с. 431].

Праз некалькі гадоў у «Казусах», адрасаваных уніяцкаму духавенству, Леў Кішка, будучы епіскап уладзімірскі і берасцейскі, выкарыстоўвае традыцыйны для каталіцкай царквы тэрмін «чысцец» пры апісанні таямніцы споведзі і пакуту, якой яна суправаджаецца: «…satisfakcya iest nagroda dana za mękę doczęsna spowiadaiacemu się za grzechy w Czyscu



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

należyta…» (“…адпушчэнне граху – гэта ўзнагарода, якая даецца споведніку за грахі, якія маглі прывесці яго ў чысцец…”) [3, s. 99]. Неабходна адзначыць, што да 60–80-х гг. XVIII ст. акты царкоўных візітацый утрымліваюць даволі сціплыя звесткі пра склад прыхадскіх бібліятэк, але ў асобных выпадках узгадваюцца менавіта «Казусы» Льва Кішкі, у той час як першыя два творы не атрымалі шырокага распаўсюджання.

Скліканы па ініцыятыве таго ж Л. Кішкі Замойскі сабор 1720 г. таксама выдаў свой катэхізіс, які напрыканцы XVIII ст. быў літаральна ва ўсіх грэка-каталіцкіх прыходах на беларускіх землях. У ім разглядаецца канцэпцыя двух судоў і прысутнічае «трэцяе месца». Звыклыя для праваслаўных мытарствы не ўзгадваюцца, але выкарыстоўваецца тэрмін “чистецъ”, і яго вызначэнне цалкам супадае з каталіцкім. Аўтарам спецыяльна робіцца акцэнт на адрозненні паміж пеклам і чыстцом: «В Чистцу якіежъ суть муки? – Такіе яко и в Пеклѣ, то есть огнь, смрад, и дїаволи мучащїи души. – То Чистецъ не рознится о(т) Пекла? – Рознится, а. бо Чистецъ тылко до часу, а Пекло на вѣки, б. Души в Чистцу тылко до часу мучатся, а в Пеклѣ на вѣки без конца, в. Душамъ в Чистцу будущымъ молитвы вѣрныхъ, службы Б(о)жїи, ялмужны, и инїе оучинки добрїе ѕѣло помагаютъ, и ними о(т) мукъ свобждаются; а будущымъ в Пеклѣ нѣчого непмагаютъ» [2, с. 447].

Агляд апісання ўніяцкіх поглядаў на замагільны свет лагічна будзе скончыць зваротам да выдання 1790 г. аўтарства Шчуроўскага, які ўслед за сваімі папярэднікамі запазычыў канцэпцыі граху, двух судоў і чыстца ў католікаў.

Такім чынам, уніяцкія святары, успрыняўшы дагматыку каталіцкай царквы, спачатку спрабавалі прыстасаваць праваслаўную тэрміналогію да каталіцкага погляду на той свет, але ўжо ў канцы XVII ст. яны спынілі гэтыя спробы. На працягу XVII–XVIII стст. уніяцкая царква падвяргалася лацінізацыі, асабліва пасля Замойскага сінода 1720 г., які прызнаў усе рашэнні Трыдэнцкага сабора [4, s. 91].

Зразумела, што ўчарашнія праваслаўныя не змаглі б адразу успрыняць новую дагматыку, менавіта таму спачатку выкарыстоўваліся знаёмыя праваслаўныя паняцці, якія напаўняліся новым сэнсам, а пасля змяніліся і назвы.

Выходзячы з усяго апісанага вышэй, мы можам прыйсці да наступных высноў. Пры фарміраванні ўяўленняў уніятаў святары першапачаткова карысталіся праваслаўнай тэрміналогіяй, але напаўнялі яе каталіцкімі догматамі. Паступова, па меры лацінізацыі ўніяцкай царквы, патрэба ў такога кшталту адаптацыі знікла і танаталагічныя ўяўленні ўніятаў ужо мала чым адрозніваліся ад каталіцкіх.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Дорожинскій, Д. Матеріяли до історії житя і смерти св. священномученика Іосафата Кунцевича, архіепископа Полоцкого / Д. Дорожинскій. – Львов : [б. в.], 1911. – 23 с.

2. Корзо, М. А. Украинская и белорусская катехетическая традиция конца XVI–XVIII вв.: становление, эволюция и проблема заимствований / М. А. Корзо. – М. : Канон+, 2007. – 671 с.

3. Kiszka, L. Nów różnych przypadków, z pełni doktorów Theologii moralney ziawiony to iest kazusy ruskiemu duchowieństwu / L. Kiszka. – Lublin : Druk. Kollegium Lubelskiego S. Jesu, 1693. – 324 s.

4. Rok, B. Człowiek wobec śmierci w kulturze staropolskiej / B. Rok. – Wrocław : Wyd. UWr, 1995. – 131 s.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова